# Урок беларускай мовы ў 1 класе па тэме «Мясціна, дзе я жыву. Памятныя мясціны»

**К. Г. Шыкеля,**
настаўнік пачатковых класаў
першай катэгорыі
СШ № 3 г. Пінска

**Мэта:** працягваць фарміраванне вымаўленчых навыкаў, развіваць фанематычны слых, узбагачаць слоўнікавы запас вучняў, развіваць мысленне і памяць, уменне чытаць па-беларуску, выхоўваць цікавасць да гістарычнага мінулага краіны.
**Тып урока:** урок фарміравання новых ведаў, вывучэння новага матэрыялу
**Метадычнае забеспячэнне:** падручнік «Беларуская мова» (1 клас), раздатачны матэрыял (карткі з заданнямі, крыжаванкі), наглядны матэрыял, ЭСН (прэзентацыя па тэме ўрока, відэа пра Плошчу Перамогі).

## Ход урока

**I. Аганізацыя пачатку ўрока**

**II. Паведамленне тэмы і мэты ўрока**

**2.1. Артыкуляцыйная размінка (франтальна)**

- Каб даведацца, аб чым мы будзем сёння гаварыць, паслухайце верш, звяртайце ўвагу на ўсе незразумелыя словы.

- Мая Радзіма – мой куточак,
Мая рака і мой лясочак,
Зямлі маёй мясціны –
Жыцця майго часіны.

- Якія словы для вас незнаёмыя?
- Як вы разумееце слова “куточак”?
- Як вы разумееце слова “часіны”?
- Як вы разумееце слова “жыццё”?
- Як вы разумееце слова “мясціны”?

***(Адказы вучняў)***

- А зараз паўтарыце верш за мной. Звяртайце ўвагу на правільнае вымаўленне ўсіх гукаў у словах.

***(Паўтарэнне верша за настаўнікам)***

- Якія вы малайцы! Тэма сённяшняга ўрока – “Памятныя мясціны”. Мы працягваем знаёмства з гістарычным мінулым краіны, сёння вы даведаецеся пра памятныя мясціны

роднага краю, пазнаёміцеся з новымі словамі і будзеце трэніравацца чытаць па-беларуску. Паглядзіце на дошку, вы можаце ўбачыць абрысы нашай краіны, а зверху – незвычайныя лініі. Што гэта такое? Здагадайцеся. *(Слайд 1)*




- Сем вясёлых маляроў
І такіх, што будзь здароў, –
Аж паўнеба распісалі.
Выйшла што – не знаюць самі.
Той, напэўна адгадае,
Хто часопіс наш чытае.
+ Вясёлка.
- Дзе і калі даводзілася вам бачыць у жыцці вясёлку? *(Слайд 2)**(Адказы вучняў)***
- А што здарылася з вясёлкай над абрысамі нашай краіны? *(Слайд 3)*




Яна згубіла ўсе свае колеры. Над абрысамі нашай краіны ёсць вясёлка. Звычайная на першы погляд, але гэта не так. Наша вясёлка – чароўная. Кожны колер змяшчае розныя заданні. Калі вы выканаеце ўсе заданні - колеры з'явяцца і вясёлка стане каляровай. Зрабіць вясёлку каляровай змогуць толькі самыя стараныя вучні, якія любяць і ведаюць сваю мову. А сярод вас ёсць такія? Падымыце руку.

- Зараз праверым. Гатовы? Пачынаем.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу**

**3.1. Знаёмства з літарай "ў"**

- Адкрываем першае заданне.
- Паглядзіце на дошку, вы можаце ўбачыць розныя словы. Паслухайце, як гучаць гэтыя словы і скажыце, што яны абазначаюць і чаму яны запісаны з вялікай літары. *(Слайд 4)*
- Брасла.., Наро..ля, Лое.., Петрыка.., Магілё.., Ва..кавыск.

+ Усе словы – гэта назвы гарадоў, таму з пачатку стаіць вялікая літара.

- Так, а які гук сустракаецца ва ўсіх гарадах? Вымавіце гук разам.

- Гэты гук абазначаецца літарай ў (у нескладовае). Прачытайце назвы гарадоў на дошцы.

- Малайцы, а зараз прачытаем склады на с.54 з гэтай літарай, паўтарайце за мной.

- ў, аў, яў, оў, ёў, ыў, іў, эў, еў, уў

- Прачытайце гэтыя склады самастойна па чарзе.

- Малайцы, вы добра прачыталі склады па-беларуску і вы атрымліваеце першы колер – фіялетавы. Рухаемся далей. *(Слайд 5)*

**3.2. Падарожжа па памятным мясцінам**

- Як вы лічыце, а якія мясціны можна назваць памятнымі? *(Слайд 6)*

***(Адказы вучняў)***

- Памятныя мясціны — гэта мясціны, звязаныя з нейкімі падзеямі, пра якія не забываюць. У кожнага чалавека ёсць свой такі куточак, часцей за ўсё гэта бацькоўская хата, дом, дзе прайшло дзяцінства. А ёсць месцы, памятныя для ўсіх жыхароў не толькі вёскі альбо горада, але і ўсёй краіны.

- Ці ведаеце вы такія памятныя мясціны?

- Заданне наступнага колеру – падарожжа па памятных мясцінах Беларусі.

**3.2.1. Работа з падручнікам на с. 54**

- Адкрыйце падручнікі на с.54. Што вы бачыце на першым малюнку? Прачытайце подпіс-назву мясціны.

+ Хатынь. *(Слайд 7)*

- Хто з вас быў у Хатыні? Што вы там бачылі? Што вас зацікавіла?

***(Адказы вучняў)***

- Хатынь – гэта вёска, якая была спалена фашыстамі разам з жыхарамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер на яе месцы знаходзіцца помнік і звіняць званы па загінуўшых. *(Слайд 8)*

- Што вы бачыце на другім малюнку? Прачытайце подпіс-назву мясціны.

+ Плошча Перамогі. *(Слайд 9)*

- Зараз я прапаную вам паглядзець відэа пра плошчу Перамогі. Пасля прагляду адкажыце на пытанне: “Дзе знаходзіцца плошча Перамогі?” *(Слайд 10 - “Відэа”)*

+ Плошча Перамогі размешчана ў самым цэнтры Мінска, на яго галоўным праспекце.

- Добра, што яшчэ вы запомнілі пра плошчу Перамогі?

***(Адказы вучняў)***

- Цэнтральнае месца ў архітэктурным ансамблі плошчы Перамогі займае абеліск Перамогі. Гэты помнік быў збудаваны ў 1954 годзе ў гонар воінаў Савецкай Арміі і партызан Беларусі, якія загінулі ў баях за вызваленне Беларусі. Вышыня абеліска складае каля 40 метраў.

- А што яшчэ знаходзіцца ў Мінску? *(Слайд 11)*

Тут знаходзяцца оперны тэатр, капліца на Востраве Слёз, дзяржаўны цырк.

- Так, а хто выступае у цырку? *(Слайды 12-13)*

+ У цырку выступаюць клоуны, гімнасты, дрэсіроўшчыкі, акрабаты.

- Так. Акрабаты выконваюць свае нумары пад самым купалам цырку. Каб за імі паспяваць – трэба вочкі трэніраваць. Давайце паназіраем за акрабатам і зробім зарадку для вачэй.

- За добрыя адказы вы атрымліваеце новы колер – сіні. *(Слайд 14)*

- А зараз паглядзіце на апошнія малюнкі. Што на іх адлюстравана?

+ Белая Вежа і Мірскі замак. *(Слайд 15)*

- Так, гэта гістарычныя помнікі. Як вы лічыце, для чаго яны будаваліся?

***(Адказы вучняў)***

- Раней замкі і вежы-крэпасці дапамагалі людзям: абаранялі іх ад захопнікаў і ворагаў.

- Вы назвалі шмат памятных мясцін і атрымалі наступны колер – блакітны. Рухаемся далей. *(Слайд 16)*

**3.3. Работа над апавяданнем “Машына Радзіма”** *(паводле У. Ліпскага)*

- Вы добра папрацавалі, і я вам прачытаю цікавае апавяданне. Прачытайце яго назву. Як вы лічыце, пра што будзе ісці размова ў апавяданні? Як завуць дзяўчынку? Зараз праверым, але спачатку паглядзіце на дошку. У апавяданні вам сустрэнуцца гэтыя словы, ці ведаеце вы іх? Паспрабуйце растлумачыць, што яны значаць. *(Слайд 17)*

цагляны дом – кирпичный дом
трохпавярховы дом – трёхэтажный дом
лесвіца – лестница
па пакоях – по комнатам
гушкалкі – качели
на падлозе – на полу
пушча – пуща, лес
яна дбала – она заботилась
падарожжа – путешествие

- Добра, апавяданне слухайце ўважліва, каб адказаць на пытанне: “Дзе жыве дзяўчынка?” *(Слайд 18)*

- Каму спадабалася апавяданне? Што вас больш зацікавіла?

- Дзе жыве дзяўчынка?

- Што Маша лічыла сваей Радзімай?

- У чым яе пераканаў дзядуля?

- Прачытайце словы на с.55 у падручніку:

| | |
|---|---|
| пад’ехалі | кватэра |
| гаспадыня | горад |
| Мар’іна Горка | Гомель |
| тлумачыў | разгарнуў |
| галоўны | убачыў |
| сяброўка | даўным-даўно |

- Растлумачце, пра якія падзеі тэксту яны нагадваюць.

***(Адказы вучняў)***

- За правільныя адказы ў вас з’яўляецца яшчэ адзін колер – зялёны. *(Слайд 19)*

- Успомніце, на чым падарожнічала Маша з дзедам. На чым яшчэ можна адправіцца ў падарожжа? *(Слайд 20)*На цягніку, караблі, самалёце.

Зараз мы праверым, як добра вы запомнілі тое, аб чым шла размова на ўроку.

**IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу**

- Успомніце, у якую гульню гулялі дзед і ўнучка?

**4.1. Гульня-крыжаванка "Гарады"**

- Мы таксама пагуляем у такую гульню. *(Слайд 21)* Вам трэба сказаць, пра якія гарады яны ўспомнілі, і запоўніць крыжаванку. Крыжаванка ў вас з памочнікамі – першай літарай назвы горада і памятнымі мясцінамі гэтых гарадоў. *(Слайд 22)*




***(Вучні запаўняюць крыжаванку)***

Л – Ліда (Лідскі замак)

М – Мінск, Магілёў (Краязнаўчы музей), Мозыр, Маладзечна, Мядзель.

Г – Гомель.

Б – Брэст (Брэсцкая крэпасць)

П – Полацк (Полацкі Спаса-Ефрасінеўскі манастыр)

- А якія вы ведаеце памятныя мясціны нашага горада? ***(Адказы вучняў)***Вы добра ведаеце памятныя мясціны роднага краю. За гэта ў вас з'яўляецца новы колер – жоўты. *(Слайд 23)* Але ў вясёлкі ёсць яшчэ адно заданне: у вас на партах ляжаць карткі з рознымі словамі. Вам трэба выбраць толькі назвы беларускіх гарадоў. Працуем самастойна. *(Слайд 24)*

Масква, Мінск, Варшава, Гомель, Кіеў, Гродна, Віцебск, Лондан, Рым, Брэст

- Вы атрымліваеце наступны колер – аранжавы. *(Слайд 25)* Застаўся апошні колер. Які? Чырвоны.

**V. Падвядзенне вынікаў урока**

- Каб атрымаць чырвоны колер, трэба падвесці вынікі ўрока.
- Пра якія памятныя мясціны Беларусі вы даведаліся?
- Як трэба ставіцца да памятных мясцін?
- Чаму трэба захоўваць у памяці важныя падзеі?
- Пра што вы можаце расказаць дома сваім бацькам?
- Што было самым цікавым?

- Падыміце руку, каму было цяжка. Якое заданне было самым цяжкім?
- А каму было лёгка?

**VI. Рэфлексія**

- У кожнага ёсць лінейка паспяховасці. Ацаніце на ёй сваю работу на сённяшнім уроку. Паглядзіце, з’явіўся чырвоны колер і наша вясёлка поўнасцю стала каляровай! *(Слайд 26)* Гэта значыць, што вы вельмі добра папрацавалі, выканалі ўсе заданні! Дзякуй за работу! Вы – стараныя вучні, добра ведаеце сваю Радзіму. Але нашы пажарожжы не заканчваюцца, вас чакае шмат цікавага далей!